**Тэхналагічная карта ўрока па беларускай літаратуры на тэму “Васіль Быкаў. «Незагойная рана». Псіхалагічнае майстэрства пісьменніка ў паказе характараў і абставін”**
**(7 клас)**

**Аксана Аляксандраўна Дзямідзік,**
настаўнік беларускай мовы і
літаратуры вышэйшай катэгорыі
Старадварэцкай БШ
Бераставіцкага раёна

**Мэта:** прааналізаваць апавяданне “Незагойная рана”, паказаць майстэрства пісьменніка ў раскрыцці характараў

**Задачы:**

У канцы ўрока вучні павінны:

– ведаць мастацкія прыёмы, якія дапамагаюць раскрыць душэўны стан маці;

– умець даваць характарыстыку галоўнай гераіні Тэклі, выдзяляць галоўнае;

– змест урока павінен спрыяць станаўленню ў вучняў антываеннага настрою і ўдзячнасці за шчасце жыць у мірны час; вучні павінны зразумець сваю ролю ў захаванні памяці аб загінуўшых.

**Месца ўрока:** гэта трэці ўрок з трох магчымых.

**Тып урока:** урок абагульнення і сістэматызацыі ведаў.

**Асноўныя тэрміны і паняцці:** рэтраспекцыя, мастацкія дэталі, эпізадычныя вобразы.

**Абсталяванне:** партрэты пісьменнікаў, выстава кніг, ілюстрацыі, прэзентацыя, экран, лэпбук “Як хораша ў свеце без вайны”.

**Метадычнае забеспячэнне:** вучэбны дапаможнік “Беларуская літаратура” для 7 класа, вучэбны дапаможнік “Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны”.

**Формы работы:** індывідуальная, парная, групавая.

**Заўвагі:** усё абсталяванне знаходзіцца на дошцы, у полі зроку вучняў, такім чынам вучні пастаянна канцэнтруюцца на тым, што неабходна для дасягнення мэты і задач урока

| | Этапы ўрока | ас | Змест | Віды дзейнасці | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Настаўніка | Вучняў |
| . | Псіхалагічны настрой | хв. | Педагог прапануе вучням разгледзець усё, што знаходзіцца на дошцы, выставу, “чорную скрыню”.<br>– Ці ёсць у вас да мяне пытанні па ўбачаным?<br>Каб сканцэнтраваць увагу вучняў і ўцягнуць іх у тэму ўрока, на дошцы прадстаўлены партрэты Васіля Быкава, Максіма Танка, Янкі Купалы, Якуба Коласа.<br>– Хто з іх не мае дачынення да тэмы ўрока?<br>*(усе, акрамя В.Быкава, таму што ён аўтар прачытанага твора)*<br>– Што агульнага ў гэтых пісьменнікаў?<br>*(яны ўсе жылі ў час Вялікай Айчыннай вайны)*<br>Давайце засяродзім вашу ўвагу на тым абсталяванні, якое знаходзіцца | Канцэнтруе ўвагу вучняў на абсталяванні да ўрока. Гэта неабходна для таго, каб не адцягваць увагу вучняў у працэсе ўрока. | Разглядваюць і настрайваюцца на тэму ўрока. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | ў класе. Вучні бяруць удзел у гульні “Праўда ці няпраўда”. На пытанне настаўніка яны ўзнімаюць картку – праўда ці няпраўда.<br>– Ці праўда, што на выставе знаходзіцца 5 кніг Васіля Быкава са школьнай бібліятэкі? (Праўда)<br>– Ці праўда, што акрамя Васіля Быкава, у класе знаходзяцца партрэты іншых пісьменнікаў? (Праўда)<br>– Ці праўда, што Васіль Быкаў нарадзіўся ў 1994 годзе? (няпраўда)<br>– Ці праўда, што адзін са зборнікаў Васіля Быкава ў нас на выставе называецца “Капитанская дочка”? (няпраўда)<br>Дзякуй за вашу ўважлівасць. | | |
| . | Пастаноўка тэмы ўрока | хв. | З “воблака слоў” неабходна сфармуляваць тэму ўрока. | На дошцы вывешвае “воблака слоў” або выводзіць на экран.<br>(Дадатак 1) | Фармулююць тэму ўрока па “воблаку слоў”. |
| | “Чорная скрыня” | хв. | 5 У чорнай скрыні знаходзяцца: пісьмо, трактар, дзяўчына, вучэбны | Настаўнік дэманструе прадметы. | Вучні мяркуюць, як гэта звязана з тэмай |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | дапаможнік “Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны”<br><br>– Што гэта значыць? Як звязана з тэмай урока? (парная работа).<br><br>Вучань, якому не хапае пары, выказвае меркаванні настаўніку.<br><br>Кожнай пары на парту кладзецца адзін прадмет.<br>*Пісьмо – пісьманосец, які прыносіць толькі сумныя навіны на працягу 16 гадоў.*<br>*Лялька – маладая дзяўчына-суседка.*<br>*Трактар – на трактары сядзеў хлопец, вельмі падобны да сына Тэклі.*<br><br>***Эпізадычныя вобразы*** *пісьманосца (які раней шкадаваў маці, але цяпер ад бездапаможнасці адказвае ёй груба (вучні зачытваюць),* | | урока ў парах. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | *дзяўчыны (з дапамогай гэтага вобраза аўтар падкрэслівае адзіноту маці, якая ні з кім не жадае гаварыць),*<br>*хлопца на малатарні (вобраз раскрывае ўсю глыбіню гора, тугі, адчаю маці, якая* ***не верыць*** *у гібель сына)*<br><br>Вучэбны дапаможнік “Генацыд беларускага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны” [4]<br>– Ці ёсць у творы доказ генацыду беларускага народу?<br><br>*(Не, у* ***дадзеным*** *творы Васіля Быкава няма доказу генацыду беларускага народа. Таму што тут ідзе размова толькі пра гібель* ***ваенных*** *людзей у час Вялікай Айчыннай вайны)* | | |
| . | Пастаноўка задач урока | хв. | Прыём “Бінга”: дадзены прыём дазваляе вучням сачыць за ходам урока. У кожную клетку ўпісваюцца задачы. У канцы ўрока вяртаюцца да задач і калі ўсе яны выкананы, клас | Вывешвае задачы ўрока на дошку (Дадатак 2).<br>Удакладняе разуменне задач. | Франтальна прапаноўваюць, як гучыць граматна тая ці іншая задача, прапаноўваюць |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | разам скандзіруе слова “Бінга”.<br>Запісаны ключавыя словы, неабходна сфармуляваць задачы разгорнутым сказам. | Ёсць адзін незапоўнены квадрат – настаўнік можа прапанаваць сваю задачу – абавязак сучаснікаў шанаваць помнікі, абеліскі, прысвечаныя загінуўшым або вучні могуць прапанаваць сваю задачу. | дапоўніць выхаваўчую задачу. |
| . | Праверка дамашняга задання | хв. | Прыём “Постарная прэзентацыя” (*вучням у парах выдаваліся тэксты – біяграфія Васіля Быкава* [2], *ілюстрацыі і 6 пытанняў: хто, што, дзе, калі, як, навошта). Пасля чытання тэксту, яны размяшчалі ілюстрацыі пад пытаннямі. На ўроку з дапамогай пытанняў і ілюстрацый узнаўлялі біяграфію Васіля Быкава – такая форма работы развівае звязнае маўленне*). (Дадатак 3) | Арганізуе прастору на дошцы для вывешвання постарнай прэзентацыі. Выбірае, хто будзе абараняць постар.<br>Падводзіць вынік сказанаму вучнямі. | Абараняюць свой постар. Адзін з вучняў з пары выступае. |
| . | Работа з тэкстам. Абагульненне | | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | прачытанага | | | | |
| | Бытавыя дэталі | [illegible] хв. | – Назавіце і **зачытайце** [1] бытавыя дэталі, якія нясуць эмацыянальную і сэнсавую нагрузку. (*Закураная печ, вышчарбленая сякера, незагароджаны двор, заткнутая шыба, кот, які некуды знік*)<br>– Паразважайце, з якой мэтай Васіль Быкаў уводзіць іх у твор.<br>*(Каб паказаць глыбіню гора старой, якое прыбіла ўсякі **інтарэс да жыцця**).* | Вывешвае на дошцы дэталі ў выглядзе ілюстрацый або выводзіць на экран (Дадатак 4) | Вучні шукаюць у тэксце бытавыя дэталі і рыхтуюць адказ на пастаўленае пытанне. |
| | Пейзаж | [illegible] хв. | Інтэрактыўная дошка Padlet [5]<br>*На інтэрактыўнай дошцы знаходзяцца ілюстрацыі, якія вучні дабавілі дома. Гэта ілюстрацыі пейзажу, які адпавядае зместу твора, такім чынам правяраем ступень валодання зместам. Ілюстрацыі неабходна падпісаць словамі з тэксту або сваімі словамі.* | Выводзіць на экран віртуальную дошку Padlet, арганізуе абмеркаванне. | Зачытваюць апісанні пейзажу, каменціруюць свае ілюстрацыі, якія падрыхтавалі дома. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | – Прачытаўшы ўважліва апісанні пейзажу ў творы, вы размясцілі на інтэрактыўную дошку ілюстрацыі, якія адпавядаюць зместу. Пракаменціруйце ілюстрацыі, якія вы дабавілі. Чаму такія ілюстрацыі? Якую сэнсавую нагрузку яны нясуць? Якая іх роля?<br><br>(*Пейзаж указвае на час і месца, на фоне змрочнай прыроды паказана бязрадаснае жыццё Тэклі – гэтак жа панура на душы гераіні*) | | |
| | Рэтраспекцыя | хв. | – Апавяданне закранае адны суткі, але мы даведваемся пра ўсё жыццё Тэклі з дапамогай звароту да мінулага. Ці ведаеце вы, як называецца | Калі вучні доўга не могуць знайсці – накіроўвае іх пашукаць у задачах урока. | Знаходзяць слова рэтраспекцыя і мяркуюць, для чаго аўтар у змест твора |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | такі прыём?<br>Знайдзіце гэта слова на дошцы.<br>(*Яно знаходзіцца ў задачах урока, у прыёме пад назвай "Бінга" – гэта рэтраспекцыя*).<br>(*Праз успаміны мы даведваемся пра дзяцінства Васількі і апошняе развітанне маці з ім*)<br>– Якая была ў Васількі пазіцыя наконт удзелу ў вайне?<br>(*Прызавуць ці не, а пайду: так трэба)*<br>– А якая пазіцыя ў сённяшняй моладзі? Што вы ведаеце пра гэта?<br>*(У аднаго з вучняў нашага класа брат пасля 11 класа спецыяльна не стаў паступаць у навучальную ўстанову, каб у лістападзе пайсці ў армію).* | | ўводзіць успаміны пра мінулае. |
| | Фізхвілінка "Дай 5" | хв. | У *сярэдзіне ўрока з мэтай развіцця эмацыянальнага інтэлекту, можна спытаць у дзяцей, якія эмоцыі яны адчуваюць і чаму, вучыць разумець свой стан. (Дадатак 5)* | Вучні становяцца спіной адзін да аднаго, уважліва слухаюць настаўніка, паказваюць пальчыкі. Калі адказы | Адказваюць на пытанні. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | *Прыём “Дай 5”. Каб даць магчымасць адпачыць, настаўнік задае лёгкія пытанні, не звязаныя са зместам твора.*<br>Калі тое, што я гавару – праўда, то вы паказваеце 2 пальцы, калі няпраўда, то – 1.<br><br>– Ці праўда, што сёння панядзелак?<br>– Ці праўда, што цяпер пара года – зіма?<br>– Ці праўда, што красота па-беларуску – прыгажосць?<br>– Ці праўда, што мы жывем у Беларусі?<br>– Ці праўда, што Новы год будзе праз два месяцы? | супадаюць, то робяць жэст – дай 5.<br><br>*Работа з творам “Незагойная рана” патрабуе высокай канцэнтрацыі ўвагі, суперажывання, таму фізхвілінка падабрана з мэтай адпачынку, пераключэння ўвагі.* | |
| | Другая назва | хв. | – Апавяданне называецца “Незагойная рана”. Што гэта значыць? А якую б назву прапанавалі вы? Аб’яднайцеся ў групу, абмяркуйце варыянты і праз 2 хвіліны адзін з вучняў выступіць і пракаменціруе | Даводзіць вучням заданне. | “Мазгавы штурм” з варыянтамі назвы твора. Такім чынам, можна ўбачыць, наколькі глыбока вучні зразумелі сэнс |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | вашы варыянты. Настаўнік не называе таго, хто будзе выступаць, каб рыхтаваліся ўсе ў групе. | | апавядання. |
| | Буктрэйлер | хв. | – Перад вамі буктрэйлер ад вучняў сярэдняй школы №26 горада Мінска. Пасля прагляду відэа, ваша задача будзе: сказаць, што б вы дабавілі ў буктрэйлер? https://www.youtube.com/watch?v=UtYCOKTedlM | Арганізуе прагляд відэа. | Абдумваюць у час прагляду, што можна дабавіць. |
| | Бінга | хв. | – Паглядзіце на нашы задачы ўважліва. І, калі мы справіліся, то давайце ўсе разам крыкнем “Бінга”. *(Такі прыём дапамагае ацаніць работу ўсяго класа)* | Звяртае ўвагу вучняў на задачы ўрока і разам з вучнямі высвятляе, ці ўдалося ўбачыць майстэрства Васіля Быкава ў раскрыцці характару Тэклі | Асэнсоўваюць, ці ўдалося дасягнуць пастаўленых задач перад урокам. |
| | Падвядзенне вынікаў | хв. | – Назавіце 3 прычыны прачытаць гэта апавяданне. | Ставіць праблемнае пытанне, каб праверыць ступень асэнсаванасці душэўнага | Разгорнута адказваюць на пастаўленае пытанне. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | стану Тэклі і майстэрства Быкава ў раскрыцці яе характару, такім чынам можна падвесці вынікі ўрока. | |
| | Выстаўленне і каменціраванне адзнак | хв. | | Згодна з дзесяцібальнай сістэмай каменціруе адзнакі. | Слухаюць каментарый настаўніка. |
| | Дамашняе заданне | хв. | – Запісаць у сшытак па літаратуры 5 варыянтаў, каму і па якой прычыне вы рэкамендуеце прачытаць апавяданне В. Быкава “Незагойная рана”.<br>На 10 балаў – зняць свой буктрэйлер да твора (можна ў пары, можна ў групе). | Дамашняе заданне вучням зразумела, так як на ўроку былі выкананы такія ж заданні. | Запісваюць дамашняе заданне ў дзённік. |

Літаратура


1. Лазарук, М. А. Беларуская літаратура: вуч. Дапаможнік/ М. А. Лазарук, Т. У. Логінава, Т. У. Сухава, Г. А. Сухава. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2023. – 254 с.
2. Васіль Быкаў. Вікіпедыя. Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Васіль_Быкаў – Дата доступу 17.10.2024

3. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для 7 класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Рэжым доступу: https://adu.by/images/2023/08/bel_lit/up-bel-lit-7.docx - Дата доступу 17.10.2024

4. Геноцид белорусского народа в годы ВОВ (5–9 классы). Рэжым доступу: https://prokuratura.gov.by/Историческая%20справка.pdf – Дата доступу: 17.10.2024

5. https://padlet.com/demidik894/padlet-m0q1so3muz4f1cyj